УДК 069:791(476)

**В. Ю. Себруковіч,**
*загадчык Музея гісторыі беларускага кіно*
*філіяла дзяржаўнай установы «Нацыянальны гістарычны музей*
*Рэспублікі Беларусь», Мінск, Беларусь*

# МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО ЯК ЦЭНТР ТРАНСЛЯЦЫІ АЙЧЫННАЙ КІНАСПАДЧЫНЫ

**Анатацыя.** Аналізуецца практычны вопыт стварэння новай пастаяннай экспазіцыі ў Музеі гісторыі беларускага кіно. Адзначаюцца асаблівасці выкарыстання інфармацыйна-камунікатыўных, інтэрактыўных тэхналогій у экспазіцыйнай прасторы і спалучэння іх з прадметным шэрагам у экспазіцыі. Падкрэсліваецца своечасовасць і актуальнасць выкарыстання сучасных інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій у музеях падобнага профілю.

**Ключавыя словы:** Музей гісторыі беларускага кіно, кінамастацтва Беларусі, інтэрактыўная экспазіцыя, інфармацыйна- камунікатыўныя тэхналогіі.

**V. Sebrukovich,**
*Head of the Museum of the History of Belarusian cinema, branch of the "National Historical Museum of the Republic of Belarus", Minsk, Belarus*

# MUSEUM OF THE HISTORY OF BELARUSIAN CINEMA AS A CENTER FOR BROADCASTING DOMESTIC CINEMA HERITAGE

**Abstract.** The article analyzes the practical experience of creating a new permanent exhibition at the Museum of the history of Belarusian cinema, a branch of the National Historical Museum of the Republic of Belarus. The author notes the features of the use of information and communication, interactive technologies in the exhibition space and their combination with the subject range in the exposition. The article emphasizes timeliness and relevance of the use of modern information and communication technologies in museums of this profile.

**Keywords:** museum of the history of Belarusian cinema, cinema art of Belarus, interactive exposition, information and communication technologies.

Дынамічнае развіццё грамадства і культуры патрабуе ад музеяў з'яўлення новых, актуальных фарматаў прэзентацыі і камунікацыі з наведвальнікам.

За апошнія дзесяцігоддзі беларускія музеі назапасілі пэўны практычны вопыт у напрамках выкарыстання інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій у сваёй дзейнасці. Шматлікія музейныя ўстановы краіны пашыраюць камунікацыйныя магчымасці не толькі за кошт прэзентацыі дзейнасці на афіцыйных сайтах, у сацыяльных сетках, але і шляхам насычэння экспазіцыі сучаснымі тэхналогіямі і спалучэння іх тым самым з рэальнай музейнай прасторай.

У рамках тэмы артыкула звернемся да практыкі дзейнасці Музея гісторыі беларускага кіно (філіяла Нацыянальнага гістарычнага музея

Рэспублікі Беларусь), у першую чаргу ў кантэксце стварэння новай пастаяннай экспазіцыі, у тым ліку з выкарыстаннем сучасных тэхналогій.

Беларускае кіно сёння займае пачэснае месца сярод іншых відаў мастацтва. Створана значная колькасць фільмаў, якія атрымалі заслужанае прызнанне на нацыянальным і міжнародным узроўнях.

У 2024 г. адзначаецца 100-годдзе беларускага кінематографа. Такі значны юбілей павышае актуальнасць наяўнасці новай экспазіцыі ў адзіным профільным дзяржаўным музеі.

Экспазіцыя Музея гісторыі беларускага кіно створана ў 2002 г. Нягледзячы на тое, што асобныя яе раздзелы абнаўляліся і ўключаліся ў новыя экспазіцыйныя рашэнні, на бягучы момант, відавочна, наспела неабходнасць стварэння інтэрактыўнай пастаяннай экспазіцыі, якая б адпавядала наступным патрабаванням:

1) адказвала на запыты сучаснай аўдыторыі;

2) адпавядала сучасным стандартам праектавання экспазіцый;

3) усебакова асвятляла працэсы станаўлення і развіцця айчыннага кінематографа;

4) выкарыстоўвала апошнія тэхнічныя дасягненні ў мультымедыйным і інтэрактыўным афармленні.

Непасрэдная мэта праекта – стварэнне цэласнай комплекснай інтэрактыўнай пастаяннай экспазіцыі, якая б шырока раскрывала тэму зараджэння, асаблівасцей развіцця беларускага кінематографа ў разрэзе розных гістарычных этапаў нашай краіны.

Перспектыўная мэта – пераўтварэнне філіяла Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь «Музей гісторыі беларускага кіно» ў адзіную пляцоўку ў Беларусі па прэзентацыі здабыткаў і даследаванні гісторыі айчыннай кінавытворчасці і кінамастацтва.

Для выканання непасрэднай мэты пастаўлены наступныя задачы:

1) абагульніць гісторыю беларускага кіно, распрацаваць навуковую канцэпцыю экспазіцыі;

2) стварыць на падставе навуковай канцэпцыі архітэктурна-мастацкае вырашэнне экпазіцыі;

3) распрацаваць канцэпцую выкарыстання інфармацыйных тэхналогій і падрыхтаваць адпаведныя матэрыялы для запаўнення лічбавых модулей экспазіцыі.

Праца па стварэнні новай экспазіцыі прадугледжвае некалькі этапаў, сярод якіх дастаткова важным і грунтоўным з'яўляўся навуковадаследчы. Ён уключыў не толькі вывучэнне патэнцыялу фондавага збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, працу ў архівах Беларусі і Расіі, супрацоўніцтва з нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм», але і вывучэнне вопыту стварэння профільных экспазіцыйй у іншых музеях.

Так, напрыканцы 2023 г. група супрацоўнікаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь наведала Дзяржаўны цэнтраль-

ны музей кіно (г. Масква). Сучасная экспазіцыя маскоўскага музея кіно створана ў 2017 г. і з'яўляецца яскравым прыкладам выкарыстання сучасных падыходаў у праектаванні экспазіцыйнай прасторы. Супрацоўнікі музея правялі экскурсію па экспазіцыі, а таксама кансультацыю па актуальных формах арганізацыі экспазіцыйнай прасторы, прысвечанай дасягненням кінематографа.

Таксама супрацоўнікі Музея гісторыі беларускага кіно наладзілі шчыльнае ўзаемадзеянне з архіўнымі ўстановамі Рэспублікі Беларусь, дзе адной з крыніц паступленняў з'яўляюцца дакументы па гісторыі айчыннага кінематографа. Адбывалася праца па пошуку матэрыялаў для новай экспазіцыі ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь.

Вялікая разнастайнасць матэрыялаў па тэме станаўлення і развіцця беларускага кінематографа захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў. Гэта і фотаздымкі першых прыватных кінатэатраў у Мінску, відэаматэрыялы першых хранікальных здымак, дакументальныя і іграввыя беларускія фільмы розных часоў, інтэрв'ю вядомых кінадзеячаў.

Такія візуальныя (фота-, кіна-, фона-) матэрыялы сталі цудоўным дапаўненнем да прадметнага шэрага ў новай пастаяннай экспазіцыі і дастаткова арганічна раскрываюць пэўныя тэмы ў фармаце, які цалкам адпавядае тэматыцы музея. Візуальнае відэанапаўненне стварае пэўную дынаміку і нагляднасць успрымання пэўнай тэмы, як дарослай, так і дзіцячай аўдыторыяй.

Храналагічныя рамкі экспазіцыі ахопліваюць больш чым 100-гадовы перыяд з часоў першых кінапаказаў на тэрыторыі Беларусі (1898) і да сучасных дасягненняў у галіне айчыннага кінамастацтва і кінавытворчасці. Асобнае месца нададзена першым беларускім кінастужкам, хранікальным фільмам падчас Вялікай Айчыннай вайны, «залатому» перыяду ў гісторыі айчыннага кінематографа (1960-я – 1980-я).

Унікальнасць новай пастаяннай экспазіцыі заключаецца таксама і ў выкарыстанні перадавых метадаў музейнай працы, лічбавых, мультымедыйных тэхналогій пры праектаванні пастаяннай экспазіцыі ў якасці сродкаў музейнай камунікацыі. Такі падыход значна пашырае магчымасці музея па захаванні, трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, спрыяе папулярызацыі здабыткаў айчыннай кінаспадчыны, дазваляе аператыўна і з найменшымі фінансавымі выдаткамі абнаўляць экспазіцыю і рабіць яе даступнай для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Пэўная дадатковая інфармацыя размешчана ў якасці кантэнту ў інтэрактыўных інфармацыйных кіёсках, праекцыйных, мультымедыйных экранах. Такая форма прадстаўлення цэлага шэрага цікавых фактаў мае магчымасць дапаўняцца, змяняцца ў залежнасці ад патрабуемай тэматыкі.

Адно з дамінуючых месцаў у экспазіцыі займае відэасцяна, на якой у рэжыме «нон-стоп» дэманструецца фота-, відэа-, аўдыякантэнт па пэўных перыядах развіцця беларускага кіно.

З інтэрактыўных элементаў у экспазіцыі таксама маецца настольная псеўдагалаграфічная ўстаноўка з дэманстрацыяй алічбаваных трохмерных мадэлей музейных прадметаў. Наведвальнікі змогуць убачыць узоры кінаапаратуры розных гадоў у фармаце адсканаваных мадэлей 3D. Кожная камера ажывае ў трохмернай галаграфічнай форме, дазваляючы наведвальнікам акунуцца ў гісторыю кінаіндустрыі.

З дапамогай псеўдагалаграфічнай прылады можна прадставіць прадметы ў новай якасці. Акрамя ўласцівасцей інтэрактыўнасці і арыгінальнасці, адсканаваныя мадэлі 3D могуць таксама выкарыстоўвацца для візуалізацыі складаных працэсаў і канцэпцый, робячы іх больш зразумелымі для наведвальнікаў. Таксама не менш важнай з'яўляецца функцыя захавання музейных прадметаў, бо выявы 3D могуць быць выкарыстаны для дакументавання і захавання каштоўных экспанатаў, а таксама для аднаўлення страчаных або пашкоджаных артэфактаў.

Такім чынам, новыя інфармацыйныя тэхналогіі аказалі ўплыў на развіццё музейнай практыкі Беларусі. Яны адкрываюць разнастайныя магчымасці для папулярызацыі матэрыяльнай і духоўнай культурнай спадчыны, для міжкультурных абменаў, а таксама валодаюць вялікім патэнцыялам для ўмацавання культурнай самабытнасці, садзейнічаюць міжкультурнаму дыялогу і стымулююць творчасць*.

Разглядаючы музей як важны сацыяльна-культурны інстытут, можна адзначыць, што ў юбілейны год (100-годдзе беларускага кінематографа) роля Музея гісторыі беларускага кіно ў якасці адукацыйна-асветнага цэнтра па патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі, як асноўнай катэгорыі наведвальнікаў, яшчэ больш узрастае. Спалучэнне ў экспазіцыі музейных прадметаў і сучасных тэхналогій па раскрыцці тэмы, дазволіць стварыць больш прывабную экспазіцыю, якая б улічвала патрэбы сучасных наведвальнікаў, павялічыла патэнцыял музейнай прасторы ў раскрыцці і разуменні наведвальнікамі канцэпцыі экспазіцыі, магчымасці інтэрактыўнага ўзаемадзеяння, тым самым фарміруючы інавацыйныя формы музейнай камунікацыі ў трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны.

---

* Джумантаева Т. А. К вопросу об освоении Интернета музеями Полоцка // Музеі і культурная спадчына як частка глабальнай інфармацыйнай прасторы : матэрыялы Міжнар. канф., Мінск–Полацк, 8–11 крас. 2002 г. / уклад.: А. Б. Сташкевіч, Т. А. Джумантаева. – [б. м.], 2002. – С. 204–205.